УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# КАЗБЯРУК УЛАДЗІМІР МІХАЙЛАВІЧ

## ЛІТАРАТУРАЗНАВЕЦ, КРЫТЫК

## 29 ЖНІЎНЯ 1923 Г. – 4 КРАСАВІКА 2016 Г.

**ФОНД № 343**

**ВОПІС № 1**

**1958–1992 гг., копіі за XVI – пач. XX ст.**

**МІНСК 2026**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 343**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ У.М. КАЗБЕРУКА | 1-3 | 1 |
| 2. | ДАРОЎНЫЯ НАДПІСЫ У.К. КАЗБЕРУКА І ЯМУ | 4-10 | 1-2 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ У.М. КАЗБЕРУКА І ІНШ. | 11-26 | 2-5 |
| 3.1. | ДАКУМЕНТЫ У.М. КАЗБЕРУКА АБ ПОШУКУ АРХІЎНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ | 11-14 | 2-3 |
| 3.2. | ДАКУМЕНТЫ АБ УДЗЕЛЕ У.М. КАЗБЕРУКА Ў МІЖНАРОДНЫХ З'ЕЗДАХ СЛАВІСТАЎ І ІНШ. | 15-18 | 3-4 |
| 3.3. | ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ У.М. КАЗБЕРУКА ПА ТЭМЕ "АЛЕСЬ ГАРУН" | 19-26 | 4-5 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ У.М. КАЗБЕРУКОМ ДЛЯ СВАІХ ПРАЦ І ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ | 27-36 | 5-7 |
| 5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ У.М. КАЗБЕРУКА | 37-38 | 7 |

## Прадмова

**Казбярук Уладзімір Міхайлавіч** нарадзіўся 29 жніўня 1923 г. у вёсцы Бандары (цяпер Беластоцкі павет Падляскага ваяводства ў Польшчы) у сялянскай сям'і. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У.І. Леніна (1949). Працаваў выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры ў Любчанскай і Нягневіцкай сярэдніх школах Навагрудскага раёна (1949–1952). Вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага (цяпет Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка) (1952–1955), працаваў выкладчыкам Полацкага педагагічнага інстытута (1955–1959). З 1959 г. – вучоны сакратар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (цяпер Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ), з 1964 г. – навуковы супрацоўнік гэтага інстытута.

Кандыдат філалагічных навук (1963), Член СП БССР (1977). Узнагароджаны медалямі.

У друку выступаў з рэцэнзіямі і крытычнымі артыкуламі з 1954 г. Аўтар манаграфій "Якуб Колас у школе" (1967 і 1975), "Ступені росту" (1974), "Паэма Якуба Коласа "Новая зямля" (1979), "Рамантычны пошук" (1983), нарыса "Якуб Колас (жыццё і творчасць)" (1962), дакладаў на VII Міжнародным з'ездзе славістаў "Традыцыі польскага рамантызму ў беларускай літаратуры XX ст." (1973) і на IX Міжнародным з'ездзе славістаў "Славянскія літаратуры і праблемы беларускага параўнальнага літаратуразнаўства (дакастрычніцкі перыяд)" (1982). Адзін з аўтараў "Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры" (1969), кнігі "Старонкі літаратурных сувязей" (1970). Для беларуска-польскага зборніка "Малыя героі вайны" (Мінск – Лодзь, 1986) пераклаў успаміны маладых польскіх удзельнікаў Другой сусветнай вайны. Пераклаў "Клад" З. Бядулі (на рускую мову, 1986), "Хітры мангуст" (ангольскія казкі, 1987), "Комбле" (грузінскія казкі, 1990) і інш. Для серыі "Школьная бібліятэка" падрыхтаваў (склаў і напісаў уступныя артыкулы) зборнікі "Беларуская літаратура XIX – пачатку XX стагоддзя" (1977), "Вытокі" (1988), "На ўсходзе сонца" (1990), кнігі Я. Коласа "На прасторах жыцця" (1986), "Голас зямлі" (1988), Я. Купалы "Спадчына" (1988) і інш.

Памёр Уладзімір Міхайлавіч Казбярук 4 красавіка 2016 г. Пахаваны ў Мінску.

Дакументы Казберука Уладзіміра Міхайлавіча паступалі ў БДАМЛМ ад яго самога ў 1980 г., 1982 г. і 2006 г. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 38 адзінак захоўвання (219 дакументаў) за 1958–1992 гг. і копіі дакументаў за XVI – пач. XX стст.

Вопіс складаецца з пяці невялікіх раздзелаў.

У першы раздзел “Рукапісы У.М. Казберука” ўвайшлі манаграфія “Паэма Якуба Коласа “Новая зямля”: У святле традыцый”, літаратуразнаўчае даследаванне “Рамантычны пошук: Назіранні над беларускім рамантызмам пачатку ХХ ст.” і артыкулы. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічнам прынцыпе (1972–1990).

Другі раздзел “Дароўныя надпісы У.М. Казберука і яму” складаецца з дароўных надпісаў У.М. Казберука супрацоўнікам ЦДАМЛМ БССР і дароўных надпісаў яму, змешчаных у гэтым раздзеле па алфавіце прозвішчаў аўтараў дароўных надпісаў: А.М. Адамовіча, Я. Арлоўскага, В.К. Бандарчыка, Б. Белаказовіча, С. Субоціна, І. Чаплароша (1959–1981).

Трэці раздзел “Дакументы навуковай дзейнасці У.М. Казберука і інш.” падзяляецца на тры падраздзелы: дакументы аб пошуку ахіўных матэрыялаў, дакументы аб удзеле ў міжнародных з’ездах славістаў, дакументы аб працы па тэме “Алесь Гарун”. Справы сістэматызаваны па храналогіі (1966–1991).

Чацвёрты раздзел “Дакументы, сабраныя У.М. Казберуком для сваіх прац і па цікавых для яго тэмах” склалі ксеракопіі і фотакопіі з архіўных дакументаў і інш., тэксты дакладаў міжнародных з’ездаў славістаў і інш. Справы сістэматызаваны тэматычна-храналагічным прынцыпе (1958–1992).

У пяты раздзел “Выяўленчыя дакументы У.М. Казберука” ўвайшло ўсяго дзве справы: фотапартрэт У.М. Казберука [1970-я–1980-я гг.] і копія фотаздымка з выявай супрацоўнікаў навуковай камісіі Інстытута беларускай культуры ў Мінску (1922). Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічнаму прынцыпу.

Прадмову склала
вядучы архівіст Г.Б. Багамолава

23.04.2026

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА

ФОНД № 343
ВОПІС № 1
1958-1992, копіі за XVI - пач. XX ст.

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 15.05.2026
№ 7

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ У.М. КАЗБЕРУКА** | | | | |
| 1 | У.М. Казбярук. "Паэма Якуба Коласа "Новая зямля": У святле традыцый". Манаграфія. Вёрстка | 1979 | 114 | 1 | |
| 2 | У.М. Казбярук. "Рамантычны пошук: Назіранні над беларускім рамантызмам пачатку XX ст.". Літаратуразнаўчае даследаванне. Вёрстка | 1983 | 92 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 3 | У.М. Казбярук. "Александр Владимирович Прушинский (Алесь Гарун) и Белорусская войсковая комиссия", "Жменька зямлі на дарагую магілу", "Заняпад і адраджэнне", "Праграма грамадскіх пераўтварэнняў", "Сацыяльныя праблемы ў дакастрычніцкай творчасці Якуба Коласа". Артыкулы. Аўтарызаваны машынапіс, асобны друкарскі адбітак, выразкі з друкаваных выданняў | 1972-1990 | 21 | 6 | |
| | **2. ДАРОЎНЫЯ НАДПІСЫ У.К. КАЗБЕРУКА І ЯМУ** | | | | |
| 4 | Дароўныя надпісы У.М. Казберука супрацоўнікам ЦДАМЛМ БССР ад 7.02.1980 г. на аўтарэфераце сваёй дысертацыі "Творчество Якуба Коласа дооктябрьского периода" і брашуры"Якуб Колас (жыццё і творчасць)" | 1962, 1963 | 31 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 5 | Дароўныя надпісы А.М. Адамовіча У.М. Казберуку на ксеракопіях шмуцтытулаў сваіх кніг | 1959-1981 | 10 | 5 | |
| 6 | Дароўны надпіс Я. Арлоўскага (J. Orlowski) У.М. Казберуку ад 29.02.1976 г. на асобным друкарскім адбітку свайго артыкула "Iwan Grozny" Jana Matejki i "Ksiaze Srebrny" Aleksego Tolstoja" ("Іван Грозны Яна Матэйкі і Сярэбраны князь Аляксея Талстога"). На польскай мове | | 4 | 1 | |
| 7 | Дароўны надпіс В.К. Бандарчыка У.М. Казберуку за 1973 г. на асобным друкарскім адбітку свайго тэксту | | 19 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | даклада (сумесна з Л.А. Малаш) "Беларуская этнаграфія і фальклор у працах славянскіх вучоных эпохі рамантызму" | | | | |
| 8 | Дароўны надпіс Б. Белаказовіча (B. Bialokozowicz) У.М. Казберуку ад 14.07.1973 г. на асобным друкарскім адбітку свайго артыкула "Slawistyka w krajach nieslowianskich" ("Славістыка ў неславянскіх краінах"). На польскай мове | | 4 | 1 | |
| 9 | Дароўны надпіс С. Субоціна У.М. Казберуку ад 22.08.1973 г. на асобным друкарскім адбітку свайго тэксту даклада "Национални књижевни контекст и његов значај за проучавање веза измебу словенских књижевности у доба романтизма" ("Нацыянальны літаратурны кантэкст і яго значэнне для вывучэння сувязей паміж славянскімі літаратурамі эпохі рамантызму"). На сербскай мове | | 6 | 1 | |
| 10 | Дароўны надпіс І. Чаплароша (I. Csaplaros) У.М. Казберуку ад 27.08.1973 г. на асобным друкарскім адбітку свайго тэксту даклада "Stosunki wegiersko-slowackie u schylku XIX wieku w swietle opinii polskiej" ("Венгерска-славацкія адносіны ў канцы XIX стагоддзя ў святле польскай думкі"). На польскай мове | | 16 | 1 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ У.М. КАЗБЕРУКА І ІНШ.** | | | | |
| | **3.1. ДАКУМЕНТЫ У.М. КАЗБЕРУКА АБ ПОШУКУ АРХІЎНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ** | | | | |
| 11 | Фотакопія заказа У.М. Казберука ў Цэнтральныя лабараторыі Архіўнага ўпраўлення Латвійскай ССР на выкананне фотакопій дакументаў са справы Цэнзурнага камітэта Галоўнага ўпраўлення па справах друку за 1905-1914 гг. аб забароне друку часопісаў "Arbeiter-Zeitung" (Вена), "Gazeta narodowa" (Львоў), "Kurjer Poznanski" (Познань), "Nowa Reforma" (Кракаў) і інш. і фотакопіі гэтых дакументаў | 1966 | 21 | 2/19 | |
| | *** | | | | |
| 12 | Фотакопія заказа У.М. Казберука ў Нацыянальную бібліятэку "Ossolineum" у Вроцлаве (Польшча) на выкананне фотакопій дакументаў са спраў "Kopiariusz dramatyczny prawdopodobnie z kolegium jezuickiego w Orszy. 1651-1700", "Zbior roznych pism wierszem y proza […] 1808" і інш. і фотакопіі гэтых | 1977 | 46 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | дакументаў | | | | |
| 13 | Фотакопіі дакументаў з Нацыянальнай бібліятэкі "Ossolineum" ў Вроцлаве (Польшча) са справы "Wiersze i listy Zofii Trzeszczkowskiej do Feliksa Zienkowicza z lat 1881-1886" ("Вершы і пісьмы Зоф'і Тржэшкоўскай да Фелікса Зянковіча за 1881-1886 гг.) (з заказу У.М. Казберука) | 1977 | 74 | 1/17 | |
| | *** | | | | |
| 14 | Фотакопія заказа У.М. Казберука ў Бібліятэку Польскай акадэміі навук у Кракаве (Biblioteki PAN w Krakowie) на выкананне фотакопій падборкі дакументаў на тэму "Listy W.K. Sawicza-Zablockiego" ("Пісьмы В. К. Савіча-Заблоцкага") за 1877-1886 гг. і фотакопіі гэтых дакументаў | 1977 | 56 | 2/12 | |
| | **3.2. ДАКУМЕНТЫ АБ УДЗЕЛЕ У.М. КАЗБЕРУКА Ў МІЖНАРОДНЫХ З'ЕЗДАХ СЛАВІСТАЎ І ІНШ.** | | | | |
| 15 | Дакументы У.М. Казберука аб яго ўдзеле ў VII Міжнародным з'ездзе славістаў у Варшаве і інш.: праграма кангрэса (друкаванае выданне), тэкст даклада У.М. Казберука "Традыцыі польскага рамантызму ў беларускай літаратуры пачатку XX ст." (асобны друкарскі адбітак) і інш. | 1972-1973 | 79 | 5 | |
| 16 | Фатаграфіі У.М. Казберука ў групах з А. Баршчэўскім, Л.К. Граўдзінай, І.Э. Жураўскай, К.П. Кабашнівавым і фатаграфіі В.К. Бандарчыка, Р.Д. Вервеса, А.І. Жураўскага, І.І. Крамко, В.П. Лемцюговай, Л.А. Малаш-Аксамітавай, М.Р. Судніка і інш. падчас VII Міжнароднага з'езда славістаў у Варшаве | 1973 | 15 | 15 | |
| | *** | | | | |
| 17 | Дакументы У.М. Казберука аб яго ўдзеле ў IX Міжнародным з'ездзе славістаў у Кіеве: пісьмо АН БССР аб папярэдняй рэгістрацыі на гэты з'езд, праграма з'езда, тэкст даклада У.М. Казберука "Славянскія літаратуры і праблемы беларускага параўнальнага літаратуразнаўства (дакастрычніцкі перыяд)" (варыянты) (машынапіс з аўтарскай праўкай і дапіскамі, асобны друкарскі адбітак) і інш. | 1982-1983 | 150 | 6 | |
| | *** | | | | |
| 18 | Запрашэнні Міністэрства культуры і Саюза пісьменнікаў БССР, прэзідыума АН БССР і інш. на святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя | 1982, 1988 | 11 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | 100-годдзю з дня нараджэння А. Гаруна і Я. Коласа на імя У.М. Казберука.<br>Праграма канцэрта Дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння Я. Коласа | | | | |
| | **3.3. ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ У.М. КАЗБЕРУКА ПА ТЭМЕ "АЛЕСЬ ГАРУН"** | | | | |
| 19 | Вершы і іншыя творы А. Гаруна 1913-1918 гг.("Людзям", "Матчын дар", "На варці", "У чужыне", "Чэлавечая кроў" і інш.), сабраныя У.М. Казберуком. Фотакопіі з друкаваных выданняў, машынапісная копія | | 9 | 8 | |
| 20 | Пісьмы У.М. Казберука К.А. Буйло, М.М. Ганчарыку, намесніку старшыні КДБ БССР В.П. Русаку аб пошуках звестак пра А. Гаруна.<br>Заявы У.М. Казберука ў КДБ БССР, ЦК КПБ (б) і інш. аб друку творчай спадчыны А. Гаруна і інш. | 1982-1987 | 24 | 10 | |
| | *** | | | | |
| 21 | Заказ на імя Г.В. Кісялёва [для У.М. Казберука] ў Цэнтральны дзяржаўны архіў кіна-фота-фона дакументаў ЛітССР на выкананне копій дакументаў са справы "Виленской судебной палаты" за 1907-1908 гг. аб судовай справе А.У. Прушынскага (А. Гаруна) і ксеракопіі гэтых дакументаў (пачатак) | 1986 | 135 | 2 | |
| 22 | Дакументы са справы "Виленской судебной палаты" за 1907-1908 гг. аб судовай справе А.У. Прушынскага (А. Гаруна) (заканчэнне).<br>Ксеракопіі | 1986 | 133 | 0 | |
| | *** | | | | |
| 23 | Дакументы архіўных розшукаў У.М. Казберука аб А.В. Прушынскім (А. Гаруну): заказ У.М. Казберука на ксеракопіі дакументаў ў Дзяржаўны архіў Іркуцкай вобласці і пісьмо архіва аб выкананні яго заказа, ксеракопіі дакументаў аб А.В. Прушынскім (А. Гаруну), зробленыя Дзяржаўным архівам Іркуцкай вобласці і Цэнтральным Дзяржаўным архівам Кастрычніцкай рэвалюцыі СССР | 1989 | 21 | 11 | |
| | *** | | | | |
| 24 | Фатаграфіі А. Баршчэўскага (Барскага), Т. Гаранскай, В. Зуёнка, А. Пяткевіча, В. Рыч, К. Сідаровіча, Ю. Туронка, В. Шведа і інш. падчас | | 20 | 20 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | адкрыцця помніка А. Гаруну на Ракавіцкіх могілках у Кракаве 24 верасня 1988 г. | | | | |
| | *** | | | | |
| 25 | Ілюстрацыйны матэрыял (выпіска з метрыкі аб нараджэнні А. Гаруна з яго судовай справы (1908), вокладка зборніка А. Гаруна "Матчын дар"(1918), фатаграфія беларускай моладзі з Беласточчыны на адкрыцці помніка А. Гаруну на Ракавіцкіх могілках у Кракаве (1988), і інш.) і малюнкі-ілюстрацыі У. Басалыгі да кнігі А. Гарун "Сэрцам пачуты звон: паэзія, проза, драматургія, публікацыя" (У.М. Казбярук - укладальнік).<br>Рэпрадукцыі і фотакопіі.<br>На Л. 34 - спіс ілюстрацый, складзены У.М. Казберуком у 1988 г. (аўтограф) | 1988, 1991 | 34 | 30 | |
| 26 | Падборка ілюстрацый да кнігі У.М. Казберука "Светлай волі зычны звон: Алесь Гарун" (фатаграфія Г. Гарэцкага на магіле А. Гаруна (1926), фотапартрэты В. Ластоўскага, А. Луцкевіча, А. Гаруна, малюнак "Беларускай хаткі" ў Мінску (рэканструкцыя В. Сташчанюка), верш М. Чарота "Памяці Алеся Гаруна", надрукаваны ў часопісе "Вольны сцяг" № 1 за 1921 г. і інш.).<br>Рэпрадукцыі, фотакопіі, выразкі з гэтага выдання | 1991 | 27 | 6/30 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ У.М. КАЗБЕРУКОМ ДЛЯ СВАІХ ПРАЦ І ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ** | | | | |
| 27 | Падборка дакументаў са спраў [Цэнтральнага дзяржаўнага архіва народнай гаспадаркі СССР] за 1861-1864 гг.<br>Ксеракопіі | 1966 | 121 | 10 | |
| 28 | Падборка дакументаў Ф. Багушэвіча аб яго навучанні ў Імператарскім Санкт-Пецярбургскім універсітэце (1861), аб звальненні яго са службы судовым следчым Канатопскага павета (1884-1885).<br>Ксеракопіі дакументаў з Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва СССР (ЦДГА СССР) у Ленінградзе | 1966 | 51 | 2 | |
| 29 | Падборка дакументаў Галоўнага ўпраўлення па справах друку МУС аб выданні ў Маскве часопіса "Кривое зеркало" (1909-1911) і інш.<br>Ксеракопіі дакументаў з Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва СССР (ЦДГА СССР) у Ленінградзе | 1969 | 62 | 3 | |
| 30 | Падборка дакументаў па еўрапейскай гісторыі | [1960-я гг.] | 91 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Новага часу (16-17 стст.).<br>Ксеракопіі з Бібліятэкі Рачыньскіх (Biblioteka Raczynskich) у Познані (Польшча) | | | | |
| 31 | "Zycie Lwa Sapiehy kanclera wielkiego […]" (фрагмент) (1837), "Poselstwo Lwa Sapiehy w roku 1600 do Moskwy: podlug dyaryusza Eljasza Pielgrzymowskiego sekretarza poselstwa z rekopisu trafem odkrytego przez Wladyslawa Trebickiego opisane" (1846).<br>Фотакопіі з друкаваных выданняў | [1960-я гг.] | 53 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 32 | В.В. Барысенка і В.У. Івашын "Роля рускай класічнай літаратуры ў развіцці рэалізму беларускай літаратуры пачатку XX ст.", Б. Бенеш (B. Benes) "Strukturni funkce pololidove literatury u Slovanu v soucasne dobe", Ж. Бонамур (J. Bonamour) "Contribution a l'etude des rapports entre le sujet et le theme de la revolte metaphysique chez Baratynskij", Г.В. Красноў "Проблемы национального характера в русской и болгарской литературах 60-х гг. XIX в.", Д.Ф. Маркаў "Проблема генезиса социалистического реализма в болгарской литературе" і інш. Тэксты дакладаў Міжнародных з'ездаў славістаў і інш. На балгарскай, беларускай, рускай, славацкай, французскай, чэшскай мовах.<br>Асобныя друкарскія адбіткі | 1958-1973 | 258 | 21 | |
| 33 | П. Калінін (P. Kalinine) "L'ecole fenetique francaise et la prose romantique en rusie (1831-1836), Я. Пелікан (J. Pelikan) "Romanticke prvky v polske a ceske literature na prelomu XIX. a XX. stoleti", П. Петрус (P. Petru) "Genologicky a komparatisticky aspekt v literarno-historickom vyskume", Ф. Селіцкі (F. Sielicki) "Aleksander Kuprin w Polsce (1905-1939)" і інш. Тэксты дакладаў Міжнародных з'ездаў славістаў і інш. На англійскай, польскай, славацкай, французскай, харвацкай, чэшскай мовах.<br>Асобныя друкарскія адбіткі | 1973-1983 | 153 | 22 | |
| 34 | Дакументы І.М. Фрадкіна аб яго удзеле ў пасяджэнні навуковага савета АН СССР "Закономерности развития мировой литературы в современную эпоху" (пісьмо ад АН СССР, павестка дня пасяджэння і тэкст даклада аб канцэпцыі VIII тома "История всемирной литературы") | 1981 | 34 | 3 | |
| 35 | Буклеты "Geschichte der russischen Literatur von den Anfangen dis 1917" ("Гісторыя рускай літаратуры ад | 1982-1983 | 22 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | яе вытокаў да 1917 года") (інфармацыя з публікацыямі на гэтую тэму), "Slawistik" ("Славістыка") (інфармацыя з падборкай новых і ўжо існуючых публікацый у галіне славістыкі) і інш. | | | | |
| 36 | С. Габрусевіч "Давайце пазнаёмімся, можа станем сябрамі", А. Латышонак "Гарун". Артыкулы. Машынапіс і выразка з газеты | 1985, 1992 | 5 | 2 | |
| | **5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ У.М. КАЗБЕРУКА** | | | | |
| 37 | Фотапартрэт У.М. Казберука | [1970-я-1980-я гг.] | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 38 | Фатаграфія супрацоўнікаў навуковай камісіі Інстытута беларускай культуры ў Мінску: М. Байкова, Я. Дылы, Я. Коласа, А. Круталевіча, Я. Купалы, Я. Лёсіка, С. Некрашэвіча, У. Чаржынскага, В. Шэмпеля і інш. (1922). Копія | | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 38 (трыццаць восем)
спраў з № 1 па № 38 , 219 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла
вядучы архівіст Г.Б. Багамолава
2026 г.

Дакументы прынялі:
вядучы архівіст аддзела
забеспячэння захаванасці
дакументаў В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.